**Заслужаны аматарскі калектыў Рэспублікі Беларусь**
**узорная студыя цыркавога мастацтва «Арэна»**
**ўстановы культуры**
**«Мазырскі цэнтр цыркавога мастацтва «Арэна»**

У верасні 2003 года ў гарадскім Палацы культуры быў створаны клуб аматараў цыркавога мастацтва. Ініцыятарам яго стварэння стала лаўрэат Усесаюзнага конкурсу артыстаў цырка Марыя Мікалаеўна Кузняцова. Яна ставіла перад сабой мэту – прыцягнуць як мага большую колькасць удзельнікаў клуба і стварыць калектыў аднадумцаў. Таму першыя ўдзельнікі займаліся ў асноўным акрабатыкай з элементамі цырка. З часам значна пашырылася праграма выступленняў удзельнікаў.

Гэта стала важнай перадумовай да пераўтварэння ў верасні 2006 года клуба ў студыю цыркавога мастацтва «Арэна», кіраўніком якой стала Кузняцова М.М., галоўным памочнікам і пастаноўшчыкам цыркавых нумароў – Барыс Рыгоравіч Кузняцоў, таксама былы артыст цырка. Разам яны Лаўрэаты Усесаюзнага конкурсу артыстаў цырка (Расія, 1986 г.), удзельнікі цыркавых праграм на лепшых манежах Беларусі, Расіі, Украіны, Нарвегіі, Польшчы, Даніі, Бельгіі, Германіі, Амерыкі, Швецыі, Карэі, Чэхіі, Латвіі, Літвы. Марыя Мікалаеўна і Барыс Рыгоравіч уладальнікі самай высокай узнагароды ў свеце цыркавога мастацтва-прыз «Залаты арол» за лепшае цыркавое шоу ў Лас-Вегасе.

У 2011 годзе клуб рэарганізаваны ў дзяржаўную ўстанову «Цэнтр цыркавога мастацтва «Арэна».

У 2013 годзе за высокія дасягненні ў галіне мастацтва і вялікі ўклад у развіццё беларускай нацыянальнай культуры ўзорнай студыі цыркавога мастацтва «Арэна» было прысвоена званне «Заслужаны аматарскі калектыў Рэспублікі Беларусь» (Пастанова Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь №23 ад 25 сакавіка 2013 г.).


NEW GENERATION
DE
MONTE.CARLO

